№12 лістапад 2009

# Настаўнік. info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

# Ацэнка, якая дапамагае вучыцца

Улетку пад Мінскам прайшоў цыкл семінараў, прысвечаных актыўнай ацэнцы - метаду, паводле якога ацэнка “дапамагае вучыцца”. Трыццаць шэсць беларускіх настаўнікаў атрымалі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з гэтым карысным інструментам вучнёўскай матывацыі.

Даклад Organisation for economic co-operation and development (OECD) ад 2005 году аргументавана даводзіць: актыўная ацэнка - эфектыўны метад паляпшэння вучнёўскіх дасягненняў, якія паспяхова матывуе моладзь да навучання цягам усяго жыцця і дае безумоўны плён у працы з цяжка навучальнымі вучнямі.

Урэшце, што ж гэта за такое дзіва - актыўная ацэнка? Пачнем з азначэння, пададзенага ў справаздачы OECD: *Актыўная ацэнка – інтэрактыўная ацэнка прагрэсу вучня і яго разумення матэрыялу, з улікам таго, якім чынам вучань будзе вучыцца далей*. Іншымі словамі, актыўная ацэнка – перадача зваротнай інфармацыі, якая дапамагае вучыцца!

Актыўная ацэнка (АА) адрозніваецца ад звыклай адзнакі тым, што найперш служыць паляпшэнню навучальнага працэсу, а не толькі фармальнаму падвядзенню яго вынікаў. Галоўная мэта АА – выхаваць у вучня пачуццё адказнасці за ўласнае



навучанне. Пры гэтым АА дапамагае настаўніку асэнсавана планаваць паасобныя крокі ў працы з вучнямі і спраўджваць іх эфектыўнасць.

**Элементы актыўнай ацэнкі**:

Што ж такога робіць настаўнік пры карыстанні АА?

- Акрэслівае мэты ўрока і фармулюе іх зразумелай для вучня мовай.
- Вызначае з вучнямі крытэрыі ацэнкі, або тое, што будзе ўлічвацца пры ацэнцы працы вучня.
- Размяжоўвае функцыі адзнакі і актыўнай ацэнкі.
- Стварае навучальную атмасферу ў супрацы з вучнямі і іх бацькамі.
- Фармулюе ключавыя пытанні.
- Задае пытанні, якія выклікаюць цікаўнасць вучня да ўрока.
- Карыстаецца зваротнай інфармацыяй.
- Практыкуе самаацэнку і ўзаемную ацэнку. -> С. 2-3

*Паэзія*

## Сяржук Сокалаў-Воюш

* * *

Як праляцелі шпарка гады,
Як незаўважна канулі.
Быццам у росных травах сляды
Зорак, што ледзь праглянулі.

І азірацца, нат назнарок,
Сёння зусім не хочацца.
Першы ўрок, апошні ўрок
Радасна далей крочыцца.

Часу хада няўмольная,
Ростані светлы жаль –
Лета апошняе школьнае
Выпуск: іспыты, баль.

Чуцца дарослым – гэта было,
Стацца дарослым – новае.
Раптам яно на яве прыйшло
Легла жыццю асноваю.

Вальс развітання. Скажам: бывай!
І спадзяемся – стрэнемся.
Толькі давай, як можаш – давай,
Будзем сабой – не зменімся...

Часу хада няўмольная,
Ростані сьветлы жаль –
Лета апошняе школьнае
Выпуск: іспыты, баль.

*25-26 кастрычніка 2009 г.*
*Бернардаў гасцінец.*

* * *

Першыя ўрокі, першыя крокі,
Поспехі і няўдачы.
Гінула нéзнань, падала ў бездань –
Шырыўся свет дзіцячы.

І паўставалі, і гартавалі,
І надавалі сілы
Мудрых навук магутныя хвалі
Ды маладосці крылы.

Кожны прайшоў і кожны агораў
Веду ў красе акрасы
Свету й святла ў канцы калідораў,
Свету й святла ў класах.

Ды зачынялі школьныя дзверы
Сцежкі ў свет праўдзівы.
Там мы шукалі праўды й даверу,
А спазнавалі дзівы.

Зрэшты, сыходзім, як і павінны,
А наўздагон вясёла
Зрокам свідроўным глядзяць
у спіну
Сумныя вочы школы.

*27 кастрычніка 2009 г.*
*Бернардаў гасцінец.*

ТЭМА НУМАРУ: АЦЭНКА, ЯКАЯ ДАПАМАГАЕ ВУЧЫЦЦА >> СТАР. 1-3

КОНКУРСЫ, АБВЕСТКІ, ПРАГРАМЫ ПАДТРЫМКІ >>> СТАР. 4

# АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА - АЦЭНКА, ЯКАЯ

1. **Акрэсленне мэтаў урока і фармуляванне іх зразумелай для вучня мовай.**

Самае важнае – ведаць, куды і па якія дасягненні ісці. Плануючы ўрок, настаўнік асэнсоўвае, якія мэты ён хоча рэалізаваць з вучнямі падчас урока. Ён прыкідвае, дзеля чаго выкладае вучням менавіта гэты матэрыял і якім чынам гэта найлепей зрабіць.
Таксама настаўнік акрэслівае, якіх дасягненняў чакае ад вучняў. Пастаўленая ім мэта павінна стаць зразумелай для кожнага вучня. Пад канец урока настаўніку і вучням трэба спраўдзіць, ці дасягнулі яны пастаўленай мэты.
Праца над мэтамі дзеліцца на тры этапы:

- Перад урокам настаўнік разважае, якія мэты ён хоча дасягнуць.
- Настаўнік паведамляе пра мэты ўрока вучням альбо вызначае іх супольна з імі. Вучні ведаюць, што і дзеля чаго яны будуць вывучаць.
- Пасля ўрока вучні разважаюць, чаму яны навучыліся.

2. **Вызначэнне разам з вучнямі крытэрыяў ацэнкі** (або таго, што настаўнік будзе ўлічваць пры ацэнцы працы вучня).

Вучань павінен ведаць, што сапраўды будзе ацэньвацца.
Мы ўжо акрэслілі разам з вучнямі мэты ўрока. Цяпер неабходна дамовіцца, на што будзем звяртаць увагу пры ацэнцы (НаШтоБуЗУ). Вядзецца пра тое, каб вызначыць доказы, факты, вынікі працы, якія прадэманструюць настаўніку і вучням, наколькі былі дасягнутыя мэты ўрока.
Да таго ж, крытэрыі прыдадуцца вучням у падрыхтоўцы да тэставання і ў выкананні іншых заданняў ці хатняга задання, з улікам пастаўленай мэты. Настаўнік, такім чынам, ацэньвае толькі тое, што абвясціў раней.

3. **Размежаванне функцыяў адзнакі і актыўнай ацэнкі.**

Традыцыйная адзнака ўжываецца пры падрахаванні набытых вучням ведаў і звычайна зводзіцца да балаў. Актыўная ж ацэнка выстаўляецца вучню, каб той асэнсаваў, што менавіта ён зрабіў добра - а што кепска, і якім чынам ён можа палепшыць сваю працу. У актыўнай ацэнцы вучань атрымлівае меньш адзнак у выглядзе балаў, затое больш - зваротнай інфармацыі ад настаўніка ды сяброў.

4. **Стварэнне навучальнай атмасферы.**

Уводзячы актыўную ацэнку, настаўнік ад самага пачатку павінен супрацоўнічаць з вучнямі. Варта адвесці пэўны час на абмеркаванне пытання: якім чынам вучні вучацца і што ім у гэтым дапамагае. Калі настаўнік здолеў стварыць спрыяльную для навучання атмасферу, гэта выяўляецца ў падвышэнні вучнёўскага пачуцця ўласнай вартасці, захопленасці навучальным працэсам, незалежнасці, здольнасці да супрацы і асэнсаваным навучанні.
Практыка паказвае, што на ўваходным этапе ўвядзення актыўнай ацэнкі як вучні, так і іх бацькі ў пэўнай ступені непакояцца з-за меншай колькасці звычайных адзнак. Усе сумневы неабходна адкрыта абмяркоўваць як з вучнямі, так і з бацькамі. Бацькі, якія ўсвядомяць, наколькі актыўная ацэнка можа дапамагчы іх дзецям, робяцца саюзнікамі сваіх дзяцей і іх настаўніка.

5. **Уменне фармуляваць ключавыя пытанні.**

Ключавыя пытанні – пытанні, якія матывуюць вучняў да развагаў. Такія пытанні пазначаюць ім шырэйшы кантэкст разгляданага матэрыялу, заахвочваюць да пошуку адказаў і мацней ангажуюць у навучанне.

6. **Валоданне тэхнікай задавання пытанняў.**

Тэхніка пытанняў у актыўнай ацэнцы грунтуецца на прыцягненні ўсіх вучняў да вырашэння пастаўленай настаў-



# ДАПАМАГАЕ ВУЧЫЦЦА

нікам задачы. Тут прыдадуцца, сярод іншага, наступныя прыёмы:

- дастатковы час, адведзены вучню на падрыхтоўку адказу;
- настаўнік адрасуе пытанне ўсім, а не толькі вучням, гатовым адказаць;
- пошук адказу ў парах;
- адсутнасць пакарання за памылковы адказ.

7. **Карыстанне зваротнай інфармацыяй.**

вучню працаваць далей.

Відавочна, зваротная інфармацыя павінна быць шчыльна звязана з крытэрыямі ацэнкі, акрэсленымі перад выкананнем задання (“НаШтоБуЗу”).

8. **Практыка ўзаемнай ацэнкі і самаацэнкі.**

Вучні – на падставе прапанаваных крытэрыяў ацэнкі – узаемна рэцэнзуюць сваю працу і падказваюць, як яе палепшыць. Гэта мае падвойны

- Што я ўжо ўмею?
- Над чым я мушу яшчэ папрацаваць?
- Што мне трэба змяніць у маім спосабе навучання?
- Якую пастанову на будучыню я павінен прыняць?

Здольнасць вучня самастойна ацаніць: колькі ён вывучыў ужо і што павінен зрабіць яшчэ, каб дасягнуць вызначаных мэтаў - дапамагае яму ў працэсе навучання і робіць з яго актыўнага ўдзельніка гэтаг працэсу.

**ПРАВІЛЫ НАСТАЎНІКА Ў ВЫКАРЫСТАННІ АА**

**1.** Я рыхтую планы і канспект заняткаў.
**2.** Я заношу ў каспект:
А. Мэты ўрока
Б. Мэты ўрока на мове вучня
В. НаШтоБуЗУ
Г. Ключавыя пытанні
Д. Узаемасувязь з папярэднімі ведамі вучня.
**3.** Я задаю вучням такія пытанні, якія дапамагаюць яму вучыцца.
**4.** Я пазбягаю пытанняў, якія не маюць адказаў.
**5.** Я чакаю адказ вучня прынамсі 5 секунд.
**6.** Я даю магчымасць адказаць на пытанне ўсім вучням.
**7.** Я заахвочваю вучняў да працы.
**8.** Я вучу вучняў адказнасці за




Зваротная інфармацыя – ключавы складнік актыўнай ацэнкі. Настаўнік, замест таго, каб ставіць адзнаку, дае вучню каментарый адносна яго працы. Удалая зваротная інфармацыя – твор мастацтва, але яна заўсёды мусіць змяшчаць чатыры элементы:
- вылучэнне і належная ацэнка моцных бакоў працы вучня,
- пазнака таго, што патрабуе паляпшэння ці дадатковай працы,
- падказкі, якім чынам вучань можа палепшыць менавіта гэтую працу,
- падказкі, у якім кірунку

сэнс: з аднаго боку, яны добра разумеюць сябра, працу якога разбіраюць, бо акурат перад тым рабілі такое ж заданне, з другога – супольна засвойваюць і паглыбляюць такія веды і навыкі, як:

- вызначэнне крытэрыяў ацэнкі (што мы ацэньваем?);
- уменне ўспрымаць зваротную інфармацыю (як адбываецца камунікацыя?)

Самаацэнка дазваляе вучням знайсці адказ на пытанні:




*Danuta Sterna. Ocenianie kształtujące w praktyce. Warszawa: Centrum Edukacji Obywatelskiej, 2008.*

іх уласны працэс навучання.
**9.** Я веру ў здольнасці вучняў і ствараю сітуацыі выкліку.
**10.** Я даю вучням магчымасць зваротнай сувязі, якая дапамагае ім вучыцца.
**11.** Я даю вучням магчымасць самаацэнкі і ўзаемнай ацэнкі.
**12.** Я паведамляю бацькам аб прагрэсе вучня.
**13.** Я даю вучням магчымасць палепшыць сваю працу і паказваю ім, як гэта можна зрабіць.
**14.** Я атрымліваю зваротную сувязь ад вучняў наконт таго, ці добра я выкладаю.
**15.** Я ствараю атмасферу супрацы, а не спаборніцтва.

# Абвесткі, конкурсы, праграмы падтрымкі

**Семінар для маладых журналістаў у Мінску: 25 - 26 лістапада 2009 г.**

Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр запрашае маладых журналістаў і пачаткоўцаў на цыкл семінараў на тэму журналісцкага даследавання ў сецive.
Іншагароднім удзельнікам прапануецца бясплатны гатэль.
Колькасць удзельнікаў абмежаваная. Заяўкі дасылайце на адрас wolf@ibb.by альбо праз факс (017) 270-39-95.

*Апошні тэрмін падачы заявак: 18 лістапада 2009 г.*

**Конкурс праектаў літоўска-беларускай супрацы**

Сацыяльна-лінгвістычная праграма LitPro ладзіць конкурс праектаў, скіраваных на развіццё беларуска-літоўскай супрацы ў сацыяльнай, культурнай, навуковай і адукацыйнай сферах. У конкурсе маюць права прымаць удзел сябры супольнасці Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (навучэнцы любой формы навучання, выкладчыкі, супрацоўнікі ЕГУ).
Правілы падачы праектаў, крытэрыі адбору і іншая інфармацыя на сайце LitPro http://litpro.lt/index.php/permanent/studentspro/76-konkursokt2009

*Апошні тэрмін падачы заявак: 22 лістапада 2009 г.*

**Культурніцкі візіт у ЗША для падлеткаў: ліпень 2010 г.**

Удзельнікі атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з амерыканскай і рэпрэзентаваць беларускую культуру.
Падрабязная інфармацыя пра крытэрыі адбору ўдзельнікаў, заяўкі на ўдзел і патрабаванні да кандыдатаў на старонцы www.ycopportunity.org/web-Forms/index.php?frmno=38.
Вынікі адбору будуць вядомыя пасля 15 снежня 2009 г.

*Апошні тэрмін падачы заявак: 29 лістапада 2009 г.*

**Трэнінг па Еўрапейскім грамадзянстве ў Чэхіі: 22–28 сакавіка 2010 г.**

Мэтавая група: кіраўнікі праекта, моладзевыя лідэры, асобы, што працуюць з моладзю.
Мэта – стымуляваць развіццё патрабавальнага, дэмакратычнага і Еўрапейскага грамадзянства, падтрымаць рэалізацыю і падвысіць якасць праграмы «Моладзь у дзеянні», прасоўваць праграмы і структуры падтрымкі асобаў, якія працуюць з моладзю.
Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці па адрасе: http://www.european-citizenship.org/cours-es/, e-mail: eeca@salto-youth.net

*Апошні тэрмін падачы заявак – 12 студзеня 2010 г.*

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта ***Nastaunik.info***
Адрас для допісаў: ***nastaunik.info@gmail.com***
Наклад 200 асобнікаў

**Экалагічная стажыроўка ў ЗША: чэрвень-лістапад 2010 г.**

EarthCorps запрашае лідэраў экалагічных арганізацыяў да ўдзелу ў шасцімесячнай экалагічнай навучальнай праграме ў Сіэтле (штат Вашынгтон, ЗША). Напрамкі навучання: экалагічная служба, пабудова грамадзянскай супольнасці, развіццё лідэрскіх якасцяў.
Навучанне бясплатнае. EarthCorps аплочвае ўдзельнікам праграмы страхоўку, пражыванне ў сем'ях, харчаванне, штомесячную стыпендыю, а таксама спрыяе ў атрыманні навучальнай візы US J-1.
Патрабаванні да стажораў: узрост 18 - 25 год, веданне англійскай мовы, адсутнасць судзімасцяў, прынамсі пяцігадовы досвед працы ў сферы экалогіі альбо прынамсі 4 гады навучання па адпаведнай спецыяльнасці.
Падрабязная інфармацыя: http://www.earthcorps.org/join_international.php

*Апошні тэрмін падачы заявак: 29 студзеня 2010 г.*

**Конкурс "Беларускі Настаўнік 2009 года"**

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай школы" абвяшчае ўжо традыцыйны конкурс для педагогаў усіх тыпаў адукацыйных і выхаваўчых установаў (ад дашкольных да каледжаў), апрача ВНУ, са стажам працы ад трох гадоў.
На кандыдата конкурса запаўняецца анкета (http://nastaunik.info/files/f/328_nast09.doc) рэкамендуючай арганізацыяй, установай ці самім педагогам.
Кантакты: тэл. 8029–7520821; tbskoly@tut.by.

*Апошні тэрмін падачы заявак: 12 снежня 2009 г.*

**Конкурс дыдактычных матэрыялаў**

Мэтай конкурсу з'яўляецца стварэнне і публікацыя новых дыдактычных матэрыялаў, якія дазволяць моладзі бліжэй пазнаёміцца з жыццём найбліжэйшых суседзяў, іх культурай, гісторыяй і традыцыяй.
Падрабязнасці конкурса і форму заяўкі на ўдзел глядзіце на http://www.rita.edudemo.org.pl/

*Апошні тэрмін падачы заявак: 31 снежня 2009 г.*

**Трэнінг па Еўрапейскім грамадзянстве ў Францыі: 12–18 красавіка 2010 г.**

Мэтавая група: кіраўнікі праектаў, моладзевыя лідэры, асобы, што працуюць з моладзю.
Мэта – стымуляваць развіццё патрабавальнага, дэмакратычнага і Еўрапейскага грамадзянства, падтрымаць рэалізацыю і падвысіць якасць праграмы «Моладзь у дзеянні», падтрымаць прафесійнае развіццё асобаў, якія працуюць з моладзю і лідэраў праз развіццё крытычнага разумення Еўрапейскага Грамадзянства, выкарыстаць яго патэнцыял у працы з моладзю.
Працоўная мова – англійская.

*Апошні тэрмін падачы заявак – 2 лютага 2010 г.*